Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка
Аддзел абслугоўвання і інфармацыі

# Хатыні вогненныя сёстры

## нацысцкая палітыка генацыду і «выпаленай зямлі» на Кобрыншчыне

*інфармацыйна-бібліяграфічны паказальнік*

Кобрын
2014

ББК 91.9:63.3(2)(4Беи)
Х25

***Складальнік***
галоўны бібліёграф аддзела абслугоўвання і інфармацыі
цэнтральнай раённай бібліятэкі *С. Д. Курачук*

Х25 **Хатыні вогненныя сёстры**. Нацысцкая палітыка генацыду і выпаленай зямлі на Кобрыншчыне : інфармацыйна-бібліяграфічны паказальнік / Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. С. Д. Курачук. – Кобрын, 2014. - 56 с. : іл.

У журботным спісе спаленых вёсак, падобна Хатыні, ёсць і вёскі Кобрынскага раёна. Гэтыя мясціны назаўсёды застануцца ў памяці людзей адвечнымі ранамі.

Асноўная мэта выдання - напамін аб чорным мінулым, якое не павінна паўтарыцца нідзе і ніколі.

Паказальнік адрасуецца ўсім, хто займаецца вывучэннем роднага краю, цікавіцца яго гісторыяй, мінулым, гісторыяй Вялікай Айчыннай вайны.

**ББК 91.9:63.3(2)(4Беи)**

© Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка, 2014

# Прадмова

Больш пяці тысяч беларускіх вёсак спалілі разам з усім насельніцтвам ці яго часткай нямецкія акупанты, з іх 628 поўнасцю падзялілі лёс Хатыні. 186 вёсак так і не былі адноўлены пасля вайны, не адрадзіліся…

У журботным спісе спаленых вёсак, падобна Хатыні, ёсць і вёскі Кобрынскага раёна. Гэтыя мясціны назаўсёды застануцца ў памяці людзей адвечнымі ранамі.

Цяпер на карце Кобрыншчыны вы не знойдзеце вёску з прыгожай назвай Арол. Яна знікла ў часы Вялікай Айчыннай, калі была спалена разам з жыхарамі. Толькі помнік-абеліск на беразе ракі сведчыць пра тое, што некалі на яго месцы былі расстраляны і спалены людзі. Аднавіць вёску не ўдалося.

Крывавым заравам полымя ўвайшоў у гісторыю Кобрыншчыны верасень 1942 года. У попел быліператвораны тры вёскі: Каменка, Рэчыца, Барысаўка, жыхары якіх сталі ахвярамі знішчальнай нямецка-фашысцкай аперацыі «Трохвугольнік».

Самыя вялікія чалавечыя і матэрыяльныя страты панесла Барысаўка, у якой загінулі 206 чалавек, спалена 225 двароў [8, с. 55].

Помнікі, мемарыяльныя комплексы памяці ўстаноўлены ў вёсках Боркі, Лука, Навасёлкі (Астроміцкага сельсавета), Чаравачыцы (Батчынскага сельсавета). Смерць і агонь уварваліся ў гэтыя вёскі ў 1943 годзе: ураталаваліся нямногія, загінулі цэлыя сем'і, дзеці, спалены забудовы.

Хатынь стала ўвасабленнем усіх вогненных вёсак, незлічоных ахвяр-пагарэльцаў, увасабленнем ідэі мужнасці, непахіснасці беларускага народа. Спаленыя вёскі - вечны праклён гітлераўскім акупантам, вечная памяць загінуўшым і вечны боль для ўсіх тых, хто жыве сёння.

У аснову паказальніка пакладзены дакументы і матэрыялы з кнігі «Нацистская политика геноцида и «выжженной земли» в Белоруссии. 1941-1944», успаміны сведкаў той жудаснай трагедыі, інтэрв'ю з жыхарамі, якія цудам засталіся ў жывых, матэрыялы з архіваў, артыкулы з перыядычных выданняў.

У сувязі з тым, што на сённяшні дзень існуюць розныя крыніцы дат і лічбаў аб спаленых вёсках, колькасці загінуўшага насельніцтва, у бібліяграфічным паказальніку выкарыстоўваецца

фактаграфічны матэрыял менавіта вышэйназванай кнігі.

Асноўная мэта выдання - напамін аб чорным мінулым, якое не павінна паўтарыцца нідзе і ніколі.

Паказальнік адрасуецца ўсім, хто займаецца вывучэннем роднага краю, цікавіцца яго гісторыяй, мінулым, гісторыяй Вялікай Айчыннай вайны.



# Нацысцкая палітыка генацыду і «выпаленай зямлі» на Кобрыншчыне

***гістарычная даведка***



*«Геноцид - один из тягчайших видов преступления против человечества, направленный на уничтожение полностью или частично какой-либо национальной, этнической, расовой или религиозной группы»*, - такое вызначэнне дадзена генацыду Генеральнай Асамблеяй ААН у рашэннях ад 9 снежня 1948 года і 11 снежня 1964 года.

Палітыка генацыду і тактыка «выпаленай зямлі» былі распрацаваны нацыстамі яшчэ да нападу на Савецкі Саюз. Спальваць беларускія вёскі нацысты пачалі з першых дзён вайны і на працягу ўсіх трох гадоў акупацыі. У рэспубліцы было праведзена больш 140 буйных карных аперацый, падчас якіх нацысты спальвалі вёскі і знішчалі мірнае насельніцтва. З восеньска-зімовага перыяду 1943-1944 гадоў, калі пачалося вызваленне Беларусі, правядзенне тактыкі «выпаленай зямлі» прыняло найболей шырокія маштабы.

Камандаванне партызанскіх фарміраванняў прымала ўсе меры, каб ратаваць насельніцтва. Арганізоўвалася абарона вёсак, ствараліся сямейныя лагеры для грамадзянскага насельніцтва, партызанскія зоны.

Вынікам нацысцкай палітыкі генацыду і «выпаленай зямлі» ў Беларусі з'явілася знішчэнне звыш 2 млн. 200 тыс. савецкіх грамадзян. Акупанты спалілі, разбурылі і разрабавалі 209 гарадоў і мястэчкаў гарадскога тыпу, 9200 вёсак, 10 тысяч калгасаў, 92 саўгаса, 100465 прамысловых вытворчых будынкаў, 1200 тысяч сельскіх будынкаў, у тым ліку 420996 хат калгаснікаў.

Падчас акупацыі было знішчана разам з жыхарамі 628 населеных пунктаў Беларусі, 165 з іх так і не былі адноўлены. 5295 населеных пунктаў знішчаны з часткай жыхароў, 325 з іх не былі адноўлены пасля вайны [8, с. 47].

За ўвесь перыяд акупацыі агульны лік расстраляных, закатаваных, спаленых людзей у г. Кобрыне і раёне склаў больш 13 тысяч чалавек, у тым ліку каля 2 тысяч дзяцей. Разбурана больш 2 тысяч жылых хат, 19 школ....

Хроніка тых падзей сведчыць, што ў Кобрынскім раёне былі спалены ці часткова знішчаны разам з людзьмі наступныя населеныя пункты:

**в. Арол** (Гарадзецкі с/с),
**в. Астраўляны** (Хідрынскі с/с),
**в. Барысаўка** (Осаўскі с/с),
**в. Баршчы** (Буховіцкі с/с),
**в. Боркі** (Астроміцкі с/с),
**в. Вялікі Рудзец** (Гарадзецкі с/с),
**в. Каменка** (Буховіцкі с/с),
**в. Лука** (Астроміцкі с/с),
**в. Навасёлкі** (Астроміцкі с/с),
**в. Рэчыца** (Буховіцкі с/с),
**в. Соўплі** (Гарадзецкі с/с),
**в. Чаравачыцы** (Батчынскі с/с).

# Населеныя пункты, спаленыя карнікамі

*карта*





д.Речица Буховичский
сельский совет
д. Каменка
Буховичский
сельский совет
д. Борки
Остромичский
сельский совет
Остромичский
сельский совет
д.Новоселки
Остромичский
сельский совет
Батчи
Кобрин
Могила жертв фашизма
д. Череватчицы Батчинский
сельский совет
д. Орел (ныне не существует)
Городецкий сельский совет
д. Борисовка
Осовский
сельский совет

# Вогненныя вёскі Кобрыншчыны

**Трагедыя ў датах:**

***лічбы і факты пра спаленыя населеныя пункты Кобрыншчыны***

| | |
|---|---|
| **5 верасня 1942 г.** | **Рэчыца** (Буховіцкі с/с) |
| **6 верасня 1942 г.** | **Каменка** (Буховіцкі с/с) |
| **23 верасня 1942 г**. | **Барысаўка** (Осаўскі с/с) |
| **22 снежня 1943 г.** | **Арол** (Гарадзецкі с/с) |
| **23 лютага 1943 г.** | **Быкі** (Астроміцкі с/с) |
| **верасень 1943 г.** | **Боркі** (Астроміцкі с/с) |
| **4 кастрычніка 1943** | **Лука** (Астроміцкі с/с) |
| **4 лістапада 1943 г.** | **Навасёлкі** (Астроміцкі с/с) |
| **7 лістапада 1943 г.** | **Чаравачыцы** (Батчынскі с/с) |
| **13 ліпеня 1944 г.** | **Павіцце** (Павіццеўскі с/с) |



# Была такая вёска Арол

***в. Арол (Гарадзецкі сельскі савет)***



Невялікую вёсачку з паэтычнай назвай Арол утварылі былыя хутаране, якіх аб'ядналі ў паселішча. Людзі сеялі хлеб, гадавалі дзяцей…

Сёння аб тым, што тут калісьці была вёска, нагадваюць толькі старыя, дзе-нідзе ўжо спарахнелыя яблыні і грушы, зараснікі бэзу. Прыгледзеўшыся, можна ўбачыць, дзе ў вясковых хатах былі печы. На гэтым месцы жылі людзі.

Была такая вёсачка з прыгожай назвай Арол. Была… Але вось ужо больш за 70 гадоў на гэтым месцы пануе пустэча. Вёска наогул перастала

існаваць пасля таго, як у гады Вялікай Айчыннай вайны яе спалілі гітлераўскія захопнікі.

Горкі лёс спасціг вёску Арол. Шмат стагоддзяў прастаяла гэта невялікая вёсачка ў глыбіні лясоў. Пасля таго, як у 1939-1940 гадах прайшла рэканструкцыя Дняпроўска-Бугскага канала, яна апынулася на самым беразе гэтай воднай трасы. Мабыць, гэта яе і загубіла. Акупанты, баючыся дыверсій на камунікацыях, вырашылі знішчыць са свету вёску, якая складалася з 12 двароў, жыхары якой, па меркаванні немцаў, маглі аказваць дапамогу партызанам.

Карнікі прыйшлі ў вёску 22 снежня 1942 года. Жыхароў сагналі ў крайнюю хату, закідалі гранатамі і спалілі. Потым падпалілі ўсе астатнія хаты.

На месцы, дзе зараз устаноўлены помнік, у тыя гады стаяла невялічкая хата Хамукоў. Яна была першай на шляху варожых салдат. Немцы зайшлі ў хату і адразу расстралялі гаспадара Івана Хамука. Акрамя яго, у доме было сямёра дзяцей. Не пашкадавалі і іх… Затым падпалілі дом. Адначасова падпалілі яшчэ 12 хат, а іх жыхароў расстралялі.

Самаму малодшаму з 18 пакутнікаў было ўсяго 4 гадкі. 12 жудасных гадзін у чаканні свайго лёсу правялі яны ў хаце, што стаяла на беразе Дняпроўска-Бугскага канала. Былі ў той хаце і Павел Паўлавіч Хамук, і Якаў Рыгоравіч Васілюк, і Марыя Іванаўна Хамук. Паўлу было тады 14, Якаву – тры, Марыі - усяго адзін год. Толькі выпадак ратаваў іх ад гібелі.

Нямецкія салдаты расстралялі 18 чалавек, а вёску спалілі. Зрабіўшы сваю жудасную справу, фашысты чакалі, пакуль вёска дагарыць, і толькі потым пакінулі яе.

Тыя, хто неяк застаўся ў жывых, а таксама людзі з суседніх вёсак пахавалі загінуўшых. Праз пяць гадоў пасля вайны астанкі жыхароў вёскі Арол былі перанесены на ўзгорак у брацкую магілу. І толькі ў далёкім 1949 годзе адбылося іх перазахаванне на вясковых могілках.

Вёска не аднавілася пасля Вялікай Айчыннай вайны, знікла з карты Кобрыншчыны. І толькі ў памяці жыхароў, іх дзяцей і родных, якія цудам ратаваліся ад немінучай смерці, засталася гэтая вёска назаўсёды.

Ціха шамацяць лісцем вакол помніка ахвярам фашызму, які установлены ў 1974 годзе, высокія дрэвы.

Сюды часта прыходзяць жыхары навакольных вёсак, школьнікі мясцовай школы, каб аддаць даніну памяці тым, хто загінуў ад рук катаў у той жудаснай вайне. Гучаць словы надзеі, што ніколі больш не будзе ступаць нага ворага па нашай зямлі, не паўторацца трагедыя вёскі Арол, падобная і іншым вёскам, якім выпаў такі ж лёс.

Памяць непадуладна часу…





# Агнём вайны адзначана

## *Барысаўка (Осаўскі сельскі савет)*



Трагічныя старонкі гісторыі мае ў сваім летапісе вёска Барысаўка, жыхары якой сталі ахвярамі знішчальнай нямецка-фашысцкай аперацыі «Трохвугольнік».

На месцы расстрэлу людзей у вёсцы пастаўлены помнік-скульптура маці ў жалобе, а на магільных плітах высечаны імёны тых, хто загінуў ад зброі карнікаў.

Да вайны ў в. Барысаўка было 230 двароў, пражывала больш 900 чалавек.

22 верасня споўнілася 72 гады з дня трагедыі вёскі Барысаўка – дня, калі 206 мірных жыхароў

былі расстраляны, а вёска – 225 двароў - спалена фашыстамі.

У ноч з 22 на 23 верасня 1942 года карнікі накіраваліся з Дзівіна ў бок Барысаўкі. Па дарозе яны пілі самагон, спявалі песні, весяліліся. Прыехаўшы ў вёску на світанні, пачалі выганяць усіх людзей з дамоў. Спачатку жыхары сядзелі на могілках, пасля была дадзена каманда сагнаць жанчын, дзяцей і старых у хлеў, які стаяў непадалёку. Мужчын жа павялі капаць вялікую яму… Яму, якая пасля стала для ўсіх адной магілай. Затым мужчын тут жа і расстралялі.

Надышла чарга тых, хто знаходзіўся ў хляве. Фашысты падводзілі да ямы людзей невялікімі групамі і расстрэльвалі, немаўлят забівалі ўдарам галавы аб зямлю. Забітых скідалі ў яму і засыпалі зямлёй. Так былі знішчаны амаль усе жыхары вёскі.

У жывых цудам засталіся некалькі жыхароў. Адна з іх, Алена Куліковіч, стала жывым сведкам той трагедыі, правобразам помніка Смуткуючай маці, які стаіць зараз якраз ля той самай агульнай магілы ў в. Барысаўка.

На мемарыяльных дошках каля абеліска ў вёсцы Барысаўка выбіта 191 прозвішча.






Іх расстралялі ў час экспедыцыі, якую праводзілі фашысты ў рамках акцыі «Трохвугольнік», накіраванай на знішчэнне партызанскага руху. Жудасны разлік - не будзе насельніцтва, не будзе ні партызанаў, ні тых, хто аказвае ім дапамогу - выліўся ў крывавую трагедыю...

З выніковай справаздачы нямецкіх войскаў па «экспедыцыі, праведзенай у Барысаўцы»: *«...У ноч на 22 верасня 9-я рота здзейсніла марш з*

*Дзівіна ў напрамку Барысаўкі. Да 4 гадзін раніцы вёска была абкружана двума ўзводамі з поўначы і поўдня. Пасля праверкі насельніцтва пры садзейнічанні паліцыі бяспекі і СД 5 сем’яў было пераселена ў Дзівін. Астатнія былі расстраляны спецыяльна выдзеленай камандай і пахаваны за 500 метраў у паўночна-ўсходнім напрамку ад Барысаўкі. Пасля таго, як насельніцтва было знішчана, прачасалі ўсю мясцовасць - жывёла, прадукты і сельскагаспадарчы інвентар былі сабраны ў адно месца і адпраўлены ў Дзівін...*».

Калі чытаеш гэтыя радкі, міжволі становіцца жудасна. У скупых канцылярскіх абзацах з лёгкасцю гаворыцца пра загубленых людзей...

Усіх, хто сёння прыязджае ў Барысаўку, сустракае помнік - белая постаць жанчыны. Вечны напамін пра чорнае мінулае, якое не павінна паўтарыцца нідзе і ніколі...



# У вёскі Боркі лёс горкі...

***в. Боркі(Астроміцкі сельскі савет)***



Верасень 1943 года... У той страшны дзень цудам ацалела М. К. Хамук. Успамінаючы пра трагедыю роднага сяла Боркі, яна распавядала, што фашысцкія карнікі пачалі аблаву апоўначы. На яе вачах фашысты загналі ў яму каля 20 дзяцей і закідалі іх гранатамі, потым знішчылі астатніх жыхароў вёскі.

Трагічна, страшна…Тады былі спалены ўсе 70 дамоў з гаспадарчымі пабудовамі, закатаваны 12 жыхароў [8, с. 87].

Назвы спаленых вёсак, у тым ліку і в. Боркі, занесены на пліты мемарыяльнага комплексу

«Хатынь», званы якога б'юць трывожнымі звонам, не даючы жывым забыцца пра тое, што такое фашызм.

Як толькі ўлетку 1944 года змоўклі гукі вайны, у Боркі вярнуліся 2-3 уцалелыя сям'і. З іх і пачалося адраджэнне знішчанай вёскі.

Нездарма кажуць, што жыццё, як тканіна ў чорныя і белыя палосы… І ў жыцці вёскі Боркі пасля чорных дзён з’явіліся белыя. Вяскоўцы паступова адбудоўваліся. З арганізацыяй калгаса тут пабудавалі ферму, што давала надзею на перспектыву, памяшканне для магазіна, у якім сяляне набывалі неабходныя прадукты і прамысловыя тавары.

У 1974 годзе для ўшанавання памяці ахвяр фашызму ўстаноўлены помнік – 5 жалезабетонных брусаў, пастаўленых адзін на аднаго.



Сёння, паводле перапісу, у Борках пражывае 36 чалавек.

# «Мы любілі жыццё...»

***в. Каменка (Буховіцкі сельскі савет)***

6 верасня 1942 года - дзень, калі ў невялікай



вёсцы Каменка Кобрынскага раёна адбылася жудасная трагедыя.

Напярэдадні вайны ў вёсцы было 73 двары і пражывала 357 чалавек.

У верасні 1942 года нямецка-фашысцкія захопнікі расстралялі 152 мірных жыхара і спалілі 48 двароў [8, с. 59].

Па ўспамінах сведкаў трагедыі, у той дзень было вельмі ціха, і нішто не прадвяшчала бяды. Тым не менш, пачуўшы шум матораў, жыхары кінуліся будзіць дзяцей-падросткаў, якіх па ўзросце маглі забраць у Нямеччыну.

Спачатку фашысты паводзілі сябе спакойна і нікога не чапалі, а потым раздалася аўтаматная чарга. Пасля таго, як з натоўпу сабраных карнікі забралі цэлую сям'ю і расстралялі на вачах аднавяскоўцаў, людзі зразумелі, што іх чакае…

Немцы атрымалі сігнал прыступіць да знішчэння Каменкі. Фашысты прымушалі жыхароў класціся на зямлю і білі іх палкамі. Лежачы тварам уніз, людзі не маглі нават прыкрыць сябе рукамі. Тых, хто спрабаваў бегчы, фашысты расстрэльвалі ў спіну. Уся вёска была ў жаху. Людзі разбягаліся ў розныя бакі, але іх наганялі кулі…

Калі стральба скончылася, немцы сагналі ўсіх жанчын, старых і дзяцей, збітых і параненых, у адзін хлеў і падпалілі. Людзі згарэлі зажыва. Калі зямля астыла, і дым толькі прабіваўся з глыбіні папялішча, карнікі прыгналі з вёскі Басяч мужчын і прымусілі іх капаць яму. Рэшткі людзей закапалі, без магільнага ўзгорка, зраўнаваўшы з зямлёй…

Адзін з жыхароў Каменкі быў настолькі ўзрушаны трагедыяй вёскі, што ў памяць пра ўсіх загінуўшых выразаў з дрэва больш 100 крыжоў і ўсталяваў на месцы згубы людзей. З часам крыжы зніклі…

…Час забірае сведак розных падзей. У вёсцы Каменка ўжо няма непасрэдных сведкаў таго, як вераснёўскім ранкам фашысцкія акупанты, сагнаўшы ўсё насельніцтва вёскі быццым бы для вырашэння пытання з закупам малака, асудзілі людзей на пакутніцкую смерць. Цудам уцалела некалькі чалавек…

Прайшоў час… Жыццё ў вёсцы адрадзілася.

На месцы трагедыі быў установлены помнік «Смуткуючай маці і салдату з дзіцём», а таксама пліты з прозвішчамі ахвяр фашызму - мужчын, жанчын, дзяцей.





Напярэдадні 60-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у помніка былі заліты дарожкі, зроблены кветнікі. Жыхары вёскі за свой кошт усталявалі тут невялікі абеліск з крыжом і іконай як даніну глыбокай пашаны да загінуўшых землякоў, усіх ахвяраў Вялікай Айчыннай вайны.



# Адна з сясцёр Хатыні

### *в. Лука (Астроміцкі сельскі савет)*



Людзі, якія ўпершыню прыязджаюць у Луку, нават і не падазраюць, што 71 год назад гэта вёска таксама перажыла трагічную падзею ў сваёй гісторыі.

У пачатку восені 1943 года паліцаі прыехалі ў Луку за жыўнасцю. За гусямі, як успамінаюць сведкі… Аб іх паяўленні паведамілі партызанам, і тыя акружылі няпрошаных гасцей. Уцячы давялося толькі аднаму, які і расказаў аб тым, што здарылася, немцам.

Вяскоўцы прадчувалі бяду, таму, прыхапіўшы самае неабходнае, падаліся ў лес. У вёсцы засталіся толькі чатыры старыя жанчыны.

Злосць гітлераўцы спагналі на вёсцы: спалілі палавіну дамоў і гаспадарчых пабудоў. Праз месяц, у святочны дзень, яны зноў прыехалі ў Луку. Акружылі вёску. Людзей адправілі ў Кобрын, дзе некаторых расстралялі, а частку адправілі ў Германію на прымусовыя работы. Перад ад’ездам гітлераўцы запалілі пабудовы, якія яшчэ ўцалелі. Цудам засталася вясковая школа, якую захопнікі потым усё ж спалілі, уцякаючы ад наступаючай Савецкай арміі. У выніку ад Лукі засталіся толькі пажарышчы.

Бяздомных, асірацелых жыхароў прытулілі сяляне з суседніх вёсак Ражок і Буды (былы Анто-пальскі, цяпер Драгічынскі раён). Няпроста было і гаспадарам, і пастаяльцам. Як успамінае Вольга Раманаўна Петруковіч, сведка трагедыі в. Лука, жылі ў страшэннай цеснаце, па 15 чалавек у пакоі. Нялёгка было і з харчаваннем. Дарослыя вырашылі вярнуцца ў родную вёску… І восенню 1944 года людзі пачалі вяртацца ў Луку.

Кажуць, час - лепшы доктар. Тройчы паленая Лука адрадзілася, стала і значна большай, і

прыгажэйшай за тую, колішнюю. З кождым годам будуюцца новыя дамы, з’яўляюцца новыя вуліцы.

Невыпадкова як сімвал павагі да загінуўшых у час вайны ў в. Лука адкрыты мемарыяльны комплекс памяці мірных жыхароў, расстраляных гітлераўцамі і загінуўшых на франтах Вялікай Айчыннай вайны, які адразу прыцягвае ўвагу.



Яшчэ да адкрыцця комплексу, у 1974 годзе, на будынку сельскага клуба была змешчана мемарыяльная дошка ў гонар загінуўшых жыхароў вёскі Лука.

На Дзень Перамогі, 9 мая 1991 года, было вялікае адкрыццё мемарыяльнага комплексу на ўшанаванне памяці загінуўшых жыхароў.

У складзе комплексу – высокая стэла, на якой знаходзіцца чырвона–жоўты ордэн Вялікай Айчыннай вайны. Чырвоная зорка, на якой серп і

молат – адзінная каляровая рэч на гэтым мемарыяльным комплексе. Увесь комплекс наогул шэрага колеру. Цэнтральнае месца займае постаць маці – жанчыны з пісьмом у левай руцэ. Яна застыла ў жалобнай позе, правую руку прыціскае да сэрца. Мабыць, прачытала ў лісце дрэнную звестку пра сына альбо мужа. Апранута жанчына ў доўгую сукенку, на галаве – жалобная накідка. Стаіць яна босая (як сімвал яе безабароннасці і роспачы). Каля яе на пастаменце ляжаць салдацкая каска і лісток дрэва. Лісток дрэва – сімвал жыцця, каска – сімвал барацьбы за гэтае жыццё.



З левага боку ад пастамента змешчана кампазіцыя, прысвечаная сынам – абаронцам Айчыны. На пярэднім плане змешчаны трынаццаць байцоў са зброяй у руках, у вайсковай форме. Адзін з іх, мабыць паранены, бо прылёг на зямлю. Справа ад параненага хутчэй за ўсё камандзір, які заклікае да абароны маці-Радзімы. У аднаго байца на плячы вісіць планшэт, другі баец рыхтуецца да бою, зараджае кулямёт. На заднім плане вядуць наступленне савецкія танкі.

Направа ад пастамента размешчаны мемарыяльныя пліты з імёнамі мірных жыхароў, расстраляных гітлераўцамі, і спісы землякоў, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны.



Сімвалічна тое, што побач з мемарыяльным комплексам бусел пабудаваў сваё гняздо, якое ніколі не пустуе. Буслінае гняздо – сімвал пераможнасці жыцця над смерцю.



І невыпадкова, што вёска Лука, неаднаразова спаленая ў гады вайны, занава адрадзілася і прыгажэе з года ў год.

# Родам са спаленай вёскі

***в. Навасёлкі (Астроміцкі сельскі савет )***



У вёсак, як і ў людзей, лёс розны. Прозвішчы ці назвы адных пастаянна на слыху, пра другіх успамінаюць зрэдку, хоць падставы для гэтага амаль што роўныя.

Так і з вёскай Навасёлкі Астроміцкага сельсвета, пра існаванне якой ведае далёка не кожны жыхар Кобрыншчыны. Для многіх яна асацыіруецца з вялікай вёскай аднайменнага сельсавета, размешчанай у процілеглым кутку раёна. А між іншым пра гэту невялічкую вёсачку, яе жыхароў таксама можна напісаць цэлую аповесць, толькі з вельмі сумным зместам...

У кастрычніку 1943 года фашысты ўварваліся ў вёску Навасёлкі Астроміцкага с/с. Карнікі расстралялі 67 жыхароў і спалілі 32 хаты [8, с. 62].

Сведкі ўспамінаюць тую раніцу, страляніну, крыкі роспачы і жаху, ахопленыя агнём дамы, гаспадарчыя пабудовы. Даведаўшыся аб наяўнасці ў вёсцы партызан, немцы, якія рухаліся з боку Лукі, акружылі Навасёлкі. Праход быў толькі адзін - на Смалярню.

Некаторым жыхарам удалося скрыцца ў лесе, адкуль яны і назіралі за тым, што робіцца ў вёсцы. Гэта іх і ўратавала. Астатнія жыхары ў свой блізкі страшны канец паверылі тады, калі іх сабралі разам, пагналі ў канец вёскі, прымусілі легчы на зямлю тварамі ўніз. Пасля ўсіх загналі ў адзін з дамоў - у хату Дзяміда Главацкага, дзе хутчэй за ўсё хацелі спаліць. Але падышла нейкая машына, і пасля гутаркі з яе пасажырамі людзей вывелі на вуліцу і пагналі ў бок горада. Тых, хто спрабаваў бегчы, забівалі на месцы.

Там было 70 чалавек, у ліку іх шмат дзяцей, цяжарных жанчын. Як стала неўзабаве вядома, з іх уцалела толькі адна Лукер'я Гадаваная, якую адправілі на прымусовыя работы ў Германію. Астатніх расстралялі ў Кобрыне, каля Пінскага моста... Старых, поўных сіл і надзей на будучыню

падлеткаў і зусім маленькіх дзяцей... 67 чалавек.

Пасля вайны Навасёлкі адрадзіліся. У вёсцы пастаўлены помнік загінуўшым землякам. Знакам удзячнасці землякам-партызанам стала перайменаванне вуліцы Пясочнай у Партызанскую.




Кожны год у дзень трагедыі цяперашнія жыхары Навасёлак прыходзяць да абеліску, каб ушанаваць памяць землякоў. У дзень смутку і памяці гучаць імёны загінуўшых мірных жыхароў вёскі і тых, хто загінуў у баях за вызваленне Радзімы; чытаюцца малітвы за супакой душ землякоў…

# Жылі ў вёсцы Рэчыца…

***в. Рэчыца (Буховіцкі сельскі савет)***




У сумным спісе спаленых вёсак Кобрыншчыны, падобна Хатыні, ёсць сяло Рэчыца.

Дзень 5 верасня 1942 года для большасці жыхароў вёскі Рэчыца стаў апошнім… Старых, жанчын і дзяцей - усяго 64 чалавека - загналі ў хлеў і спалілі. Была спалена і вёска (45 двароў) [8, с. 64].

Фашысты прыехалі ў вёску на досвітку. Дзве машыны. Спачатку нікога не чапалі. Вяскоўцы

думалі, што будуць забіраць моладзь у Нямеччыну.

Частка фашыстаў паехала ў глыбіню лесу ў пошуках лагера партызан. Лагер знайшлі… І вярнуўшыся, пачалі расправу з мясцовымі жыхарамі за тое, што тыя дапамагалі партызанам. Вёску акружылі аўтаматчыкі, з абодвух канцоў вуліцы ўстанавілі кулямёты. Больш як 30 чалавек – жанчын, дзяцей, старых мужчын - усіх, хто быў дома, сагналі ў хлеў СцяпанаКівакі. Людзі згарэлі зажыва…

Усе, хто застаўся ў жывых, вярнуліся на папялішча і ўбачылі жудасную карціну таго, што засталося ад пажарышча. Жыхары прынеслі з сядзіб лапаты, пачалі капаць адну на ўсіх брацкую магілу. Іх і пахавалі на тым месцы, дзе загінулі.

Ніхто не ведаў, што тым часам караценлі ізноў




робяць сваю чорную справу - паляць і забіваюць жыхароў вёскі Каменка.

І сюды, да сціплай магілы на ўскрайку вёсачкі, у якой цяпер жыццё цепліцца толькі ў некалькіх дамах, прыходзяць тыя, хто ўцалеў ад расправы:

былыя жыхары навакольных хутароў, родзічы загінуўшых. Прыходзяць, каб ускласці кветкі на магіле, памаліцца за ўпакаенне душ нявінна загубленых. Успамінаюць той страшны дзень, гібель родных, сваё цудоўнае выратаванне.

У 1965 годзе на месцы гібелі жыхароў на паўднёва-ўсходняй ускраіне вёскі ўстаноўлены абеліск.



# А навокал палалі дамы…

***в. Чаравачыцы (Батчынскі сельскі савет)***

Вёска са шматвяковай гісторыяй (*упершыню Чаравачыцы згадваюцца ў 1417 годзе*), утульнымі хутаркамі прывольна раскінулася паміж чыгункай і ракой Мухавец. Жыхары сядзібаў жылі спакойным, мерным жыццём: працавалі на палях, утрымоўвалі жыўнасць…



У лістападзе 1943 года трагічны лёс спасціг вёску. Тут у адзін дзень загінула 56 чалавек [8, с. 66]. У жывых засталіся толькі тыя, чые хаты не паспелі падпаліць, хто паспеў уцячы, ці тыя, хто змог выскачыць з палыхаючых будынкаў. Так невялікая вёска ў 18 двароў, на правым беразе Мухаўца, стала яшчэ адной агністай вёскай Беларусі.

…Познім вечарам 6 лістапада недалёка ад вёскі быў пушчаны пад адхон нямецкі эшалон, які ішоў у маскоўскім кірунку. У тую ж ноч выпаў

першы снег... Немцы, якія прыбылі да месца выбуху, вызначылі, што сляды вялі ў Чаравачыцы.

Праз некаторы час з Кобрына да гітлераўцаў прыйшло падмацаванне. Немцы ішлі ланцугом, падпальваючы адрыны і хаты. Педантычна і бязлітасна выводзілі і расстрэльвалі жыхароў - быццам рабілі звычайную сваю працу.

Карнікі не літавалі нікога. Так, у сям'і Якусь было трое дзяцей, самай старэйшай - 7 гадоў. Дваіх гітлераўцы расстралялі, паўгадавалае дзіця пратыкнулі штыком.

…Хавалі загінуўшых сваякі з суседніх і аддаленых вёсак, у страху і спяшаючы. Ацалелых сірот забралі сваякі ці проста добрасардэчныя людзі.

Надзея Глінская, Лідзія Мазур, Алена Глінская, Кацярына Жук, Марыя Глінская - сведкі тых страшных падзей. Ім вельмі цяжка ўспамінаць пераЖытае, ноч, агнём якой адзначыла іх жыццё вайна. Але ўспаміны дапамагаюць не забыць…

Пасля вайны вёска была адноўлена.

На ўшанаванне памяці ахвяр фашызму ў 1975 годзе ў вёсцы ўстаноўлены помнік – пяць жалезабетонных брусаў адзін на адным.

Сёння помнік утрымліваецца ў належным стане – вёска ніколі не забудзе свой страшны боль. Сюды прыходзяць, каб аддаць даніну памяці загінуўшым вяскоўцам.





Паводле апошняга перапісу Чаравачыцы налічваюць 48 жыхары.

# Каб памяць жыла…

***Фотаагляд***



Помнікі, абеліскі, мемарыяльныя дошкі… Яны сустракаюць нас і ў вялікіх гарадах, і ў зусім маленькіх вёсачках… І нават там, дзе вёсак больш няма ўвогуле – там, дзе яны назаўсёды згінулі ў полымі той страшнай вайны.

Помнікі - гэта даніна глыбокай пашаны да ўсіх герояў і ахвяраў Вялікай Айчыннай вайны. Гэтыя знакі вечнай падзякі нашчадкаў заклiканы аказваць глыбокае эмацыйнае ўздзеянне на цяперашняе і будучыя пакаленні, фарміраваць патрыятычныя і грамадзянскія якасці моладзі, гонар за краіну.

# Мемарыяльныя комплексы, помнікі ахвярам фашызму





## АРОЛ

***месца спаленай вёскі***



## ЛУКА

***мемарыяльны комплекс ахвярам фашызму***



## БАРЫСАЎКА

***помнік ахвярам фашызму***





**РЭЧЫЦА**

***абеліск ахвярам фашызму***





**КАМЕНКА**

***помнік «Смуткуючая маці і салдат з дзіцём»***





# БОРКІ

***помнік***

***ахвярам фашызму***



# ЧАРАВАЧЫЦЫ

***помнік ахвярам***

***фашызму***



# НАВАСЁЛКІ

***помнік землякам***



# Спіс крыніц


1. **[Вогненныя вёскі]**. Помнікі Вялікай Айчыннай вайны // Гісторыка-культурная спадчына Кобрыншчыны. – Баранавічы, 2001. - С. 17-28.

2. **Каменка** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Т. 4. Брэсцкая вобласць. - Мінск, 2007. - Кн. 2. - С. 152.

3. **Кобринский район** // Свод памятников истории и культуры Белоруссии. Брестская область / АН БССР, Ин-т искусствоведения, этнографии и фольклора, БСЭ ; ред. кол.: С. В. Марцелев (гл. ред.) [и др. ]. – Минск, 1990. – С. 253-264.

4. **Кобрынскі раён.** 1941-1945 // Памяць Беларусі : рэспубліканская кніга. – Мінск, 2005. – С. 118-121.

Кобрынскі раён у гады Вялікай Айчыннай вайны, аб спаленых вёсках Кобрыншчыны.

5. **Кобрынскі раён** // Збор помнікаў гісторыі і кльтуры Беларусі. Брэсцкая вобласць. – Мінск, 1984. – С. 228-239.

6. **Лука** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Т. 4. Брэсцкая вобласць. - Мінск, 2007. - Кн. 2. - С. 161.

7. **Навасёлкі** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Т. 4. Брэсцкая вобласць. - Мінск, 2007. - Кн. 2. - С. 170.

8. **Нацистская** политика геноцида и “выжженной земли” в Белоруссии (1941-1944). – Минск, 1984. – 271 с. : ил.

Из содержания: Борисовка – с. 55, Большой Рудец – с. 86, Борки – с. 87, Борщи – с. 88, Каменка – с. 59, Лука – с. 61, Новосёлки – с. 62, Орел – с. 73. Островляны –с. 162, Повить – с. 168, Речица – с. 64, Совпли – с. 188, Черевачицы – с. 66.

9. **Помнікі** Вялікай Айчыннай вайны : [в. Арол – месца спаленай вёскі (фотаздымак), в. Барысаўка – магіла ахвярам фашызму, в. Боркі – помнік ахвярам фашызму, в. Каменка – магіла ахвяр фашызму (фотаздымак), в. Навасёлкі (фотаздымак), в. Рэчыца – магіла ахвяр фашызму, в. Чаравачыцы] // Гісторыка-культурная спадчына Кобрыншчыны / аддзел культуры Кобрынскага райвыканкама; склад. Ю. А. Барысюк. – Баранавічы, 2001. – С. 17-28.

10. **Рэчыца** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Т. 4. Брэсцкая вобласць. - Мінск, 2007. - Кн. 2. - С. 183.

11. **Сергіевіч, В. П.** Трагедыя вёскі Барысаўка / В. П. Сергіевіч // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 166-168 : фота.

12. **Трагедия** белорусских деревень. 1941-1944 гг. : документы и материалы. - Минск-Москва, 2011.

Часть документов из сборника - о трагедии деревень Кобринского района: Речица, Черевачицы, Орёл, Новосёлки, Борки, Лука.

13. **«Трохвугольнік»** // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. - Мінск, 2001. – Т. 6, кн. 1: Пузелі - Усая. - С. 521.

14. **«Трохвугольнік»** // Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны. 1941-1945 : энцыклапедыя. – Мінск, 1990.- С. 591.

15. **Чаравачыцы** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Т. 4. Брэсцкая вобласць. - Мінск, 2007. - Кн. 2. - С. 194-195.

16. **Веренич, Т.** У войны не детское лицо / Тамара Веренич // Кобрынскі веснік. – 2014. – 2 красавіка. – С. 3.

В Городецком детском саду-средней школе состоялась встреча учащихся с М. Хомук, оставшейся в живых жительницей д. Орёл, сожжённой в годы Великой Отечественной.

17. **Курачук, С.** Хатыни огненные сёстры / Светлана Курачук // Кобрин-информ. - 2013. - 21 марта. - С. 23.

Накануне трагической даты - 70-летия со дня уничтожения немецко-фашистскими захватчиками д. Хатынь – в центральной библиотеке организована выставка-боль «Хатыні вогненныя сёстры”.

18. **Курачук, С.** Хатыні вогненныя сёстры: 22 сакавіка – 70 гадоў з часу знішчэння в. Хатынь / Святлана Курачук // Кобрынскі веснік. – 2013. – 20 сакавіка. – С. 2.

Напярэдадні трагічнай даты ў чытальнай зале цэнтральнай бібліятэкі пад такой назвай арганізавана выстава-боль, прысвечаная вогненным вёскам Кобрыншчыны.

19. **Пашковіч, Л.** Памятаць заўсёды…/ Людміла Пашковіч // Кобрынскі веснік. – 2012. – 29 верасня. - С. 2.

22 верасня споўнілася 70 гадоў з дня трагедыі вёскі Барысаўка.

20**. Савченко, Н.** «Мы любили жизнь» / Надежда Савченко // Кобрынскі веснік. –2012. – 14 студзеня.- С. 4.

О трагедии деревни Каменка.

21. **Савченко, Н.** Жили в селе Речица / Надежда Савченко // Кобрынскі веснік. – 2011. - 3 снежня. – С. 8.

В печальном списке сожженных деревень есть и деревня Речица.

22. **Савченко, Н.** На волосок от смерти / Надежда Савченко // Кобрынскі веснік. – 2011. – 15 кастрычніка. – С. 4.

Л. П. Мазур рассказывает о страшной судьбе родной деревни Черевачицы.

23. **Савченко, Н.** «Мне шел всего 9-й год…» / Надежда Савченко // Кобрынскі веснік. – 2011. – 8 кастрычніка. – С. 3.

Воспоминания Н. Т. Трубчик из д. Леликово, пережившей страшные моменты фашистской оккупации в неполные 9 лет.

24. **Бялоў, Д.** Барысаўка – 1942 : гісторыя трагедыі / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. – 2009. – 3 чэрвеня. – С. 3.

25. **Патоня, В**. Трагічныя старонкі гісторыі / Вікторыя Патоня // Кобрынскі веснік. – 2009. – 7 сакавіка.

26. **Петровская, М.** Огнем войны отмечена / Мария Петровская // Кобрынскі веснік. – 2007. – 8 мая.

О трагедии деревни Черевачицы.

27. **Петровская, М.** Не гаснет памяти свеча… / Мария Петровская // Кобрынскі веснік. – 2007. – 26 верасня. – С. 1, 4.

О трагедии деревни Борисовка.

28. **Петручик, Л.** Трагедия деревни Каменка / Л. Петручик // Кобрин-информ. – 2005. – 12 мая.— С. 14.

29. **Сморжук, А.** Могила у дома / Анна Сморжук, Ольга Сергиевич // Кобрынскі веснік. - 2005. - 21 мая.

О трагедии семьи хуторянина Ипполита Пашковича близ д. Борисовки.

30. **Свитич, К.** И память сердце тревожит / Кристина Свитич // Кобрин-информ. – 2004. – 26 февраля. – С. 14.

Учащиеся СШ № 8 посетили очевидцев трагедии деревни Орел, Камень.

31. **Пятроўская, М.** Адна з сясцёр Хатыні / Марыя Пятроўская // Кобрынскі веснік. - 2003. - 22 сакавіка. – С. 6.

Жыхарка Лукі В. Петруковіч успамінае пра трагедыю вёскі ў гады вайны.

32. **Савчук, М.** Сожженный Орел / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2003. - 8 мая. - С. 1- 2.

О трагедии деревни Орел.

33. **Савчук, М.** Трагедия деревни Борисовка / Маргарита Савчук // Кобрин-информ – 2003. – 19 июня. – С. 2.

34. **Славин, В.** Родом из сожженной деревни / Виктор Славин // Заря. - 2003. - 20 ноября.

60 лет назад была уничтожена фашистами деревня Новоселки.

35. **Хільчук, М.** А навокал палалі дамы / Марыя Хільчук // Кобрынскі веснік. – 2003. – 27 снежня.– С. 3.

Як былі знішчаны вёскі Арол і Камень.

36. **Хільчук, М.** З гадамі боль сэрца не змяншаецца / Марыя Хільчук // Кобрынскі веснік. - 2003. – 12 лістапада.

Аб трагедыі вёскі Навасёлкі.

37. **Хільчук, М.** Усё трывожаць успаміны / Марыя Хільчук // Кобрынскі веснік – 2003. – 21 чэрвеня.

Аб трагедыі вёскі Навасёлкі.

38. **Хільчук, М.** Абпаленыя… / Марыя Хільчук; са слоў Фяўронні Максімук і Ганны Кавалевіч; фота А. Шугая // Кобрынскі веснік. – 2002. – 8 мая.

Аб трагедыі вёсак Кобрыншчыны.

39. **Чирун, А**. К печальным датам возвращаясь… / Александр Чирун // Кобрынскі веснік. – 2002. – 9 кастрычніка.

О трагической судьбе восьми кобринских деревень, уничтоженных фашистами.

40**. Субота, В**. Была такая вёска Арол…/ В. Субота // Кобрынскі веснік. – 1997. – 9 ліпеня.

41. **Пятроўская, М.** Дзень вяртання ў мінулае / Марыя Пятроўская; фота А. Шугая // Кобрынскі веснік. - 1996. - 14 верасня.- С. 2.

Дзень 5 верасня 1942 г. для большасці жыхароў вёскі Рэчыца стаў апошнім.

42. **Шугай, А.** Жывуць і помняць / Анатоль Шугай. // Кобрынскі веснік. - 1995. - 8 мая.

Трагічны лёс в. Арол раздзялілі і яе жыхары.

43. **Каменка, Речица, Черевачицы** // Белорусские деревни, уничтоженные в годы Великой Отечественной войны 1941-1944 годы [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://db.narb.by/search/1923. – Дата доступа: 07.04.2014.

44. **Студенты** БрГТУ шефствуют над мемориалом «Скорбящая Мать», что в д. Борисовка // Виртуальный Брест [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://virtual.brest.by. - Дата доступа: 23 марта 2014.

# Змест

**Прадмова** 3

**Нацысцкая палітыка генацыду і «выпаленай зямлі» на Кобрыншчыне:** *гістарычная даведка* 6

**Вогненныя вёскі Кобрыншчыны**

**Трагедыя ў датах** : *лічбы і факты пра спаленыя населеныя пункты Кобрыншчыны* 11

**Была такая вёска Арол…:** *в. Арол (Гарадзецкі с/с )* 12

**Агнём вайны адзначана:** *в. Барысаўка (Осаўскі* с/с) 16

**У вёскі Боркі лёс горкі…** *: в. Боркі (Астроміцкі с/с)* 20

**Мы любілі жыццё…:** *в. Каменка (Буховіцкі с/с)* 22

**Адна з сясцёр Хатыні:** *в. Лука (Астроміцкі с/с)* 26

**Родам са спаленай вёскі:** *в. Навасёлкі (Астроміцкі с/с)*32

**Жылі ў вёсцы Рэчыца…:** *в Рэчыца (Буховіцкі с/с)* 35

**А навокал палалі дамы…:** *в.Чаравачыцы (Батчынскі )* 38

**Каб памяць жыла…:** *фотаагляд* 41

**Спіс крыніц** 47

# Хатыні вогненныя сёстры

***інфармацыйна-бібліяграфічны паказальнік***

Складальнік
Курачук Святлана Дзмітрыеўна

Камп’ютарная вёрстка С. Д. Курачук
Дызайн вокладкі П. С. Грыневіча

На беларускай, рускай мовах

Надрукавана на камп’ютарна-выдавецкай сістэме Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі

Вул. Маршала Жукава, 12, 225306, г. Кобрын
Цэнтральная раённая бібліятэка
E-mail kobrinlib@gmail.com
www.krcls.by